УДК 378.016:811

# ПРА СФАРМІРАВАНАСЦЬ НАВЫКУ СКЛАДАПАДЗЕЛУ Ў СТУДЭНТАЎ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ “ПАЧАТКОВАЯ АДУКАЦЫЯ”

**Доўгаль Дзмітрый Аляксандравіч**
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова
(г. Магілёў, Беларусь)

*Артыкул прысвечаны разгляду сфарміраванасці навыку складападзелу ў студэнтаў спецыяльнасці “Пачатковая адукацыя”. На аснове эксперыментальных даных робіцца выснова аб недастатковай сфарміраванасці ўказанага навыку ў будучых настаўнікаў пачатковых класаў.*

**Ключавыя словы:** склад, складападзел, навык складападзелу, спалучэнні зычных гукаў.

*The article deals with the formation of the syllabic division skill among students of the speciality “Primary Education”. On the basis of experimental data the conclusion is made about the insufficient formation of this skill among future teachers of Primary School.*

**Keywords:** syllable, syllabic division, syllabic division skill, consonant combinations.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Склад як фанетычная адзінка вывучаецца ў 2-м класе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі (раздзел "Гукі і літары"). У выніку знаёмства з тэмай у вучняў павінна быць сфарміравана практычнае ўменне падзяляць словы на склады ў вусным маўленні і абазначаць складападзел на пісьме. Авалоданне падзелам слоў на склады ляжыць у аснове засваення некаторых правіл арфаграфіі, перадусім пераносу слоў.

Настаўнік, фарміруючы ў вучня дадзенае ўменне, павінен сам беспамылкова ажыццяўляць складападзел, валодаючы неабходнымі лінгвістычнымі і метадычнымі ведамі. Пры вывучэнні беларускай і рускай моў студэнты знаёмяцца з санорнай тэорыяй склада, згодна з якой гукі ў складзе размяшчаюцца па ўзрастаючай гучнасці. Найбольш гучнымі з'яўляюцца галосныя (Г), за імі ідуць санорныя гукі [й] і [ў], затым – усе іншыя санорныя (С) і, нарэшце, шумныя (звонкія і глухія) зычныя (Ш). Падзел на склады лёгка ажыццяўляецца ў словах з чаргаваннем галосных і зычных, а таксама ў выпадках спалучэння двух галосных гукаў: *ма|ла|ко, па|эт*. Цяжкасці ўзнікаюць тады, калі ў сярэдзіне слоў ёсць кансанантныя спалучэнні. У такім выпадку магчымы наступныя варыянты іх падзелу, абумоўленыя артыкуляцыйна-акустычнымі характарыстыкамі зычных:

1) мяжа складападзелу праходзіць перад спалучэннем шумных зычных або шумнага з санорным: *ка|зка, ба|гна*;

2) мяжа праходзіць паміж зычнымі, першы з якіх санорны, а другі шумны (*мар|ка*), або паміж зычнымі ў спалучэннях, якія пачынаюцца з [й] або [ў] (*даў|но*);

3) дапускаюцца варыянты складападзелу кансанантных комплексаў, якія складаюцца з двух санорных гукаў: *со|льны* або *соль|ны*.

Аналіз вучэбных дапаможнікаў па мове, якія выкарыстоўваюцца ў 2-м класе школ з беларускай мовай навучання [1; 2], засведчыў, што вучням для аналізу прапануюцца ўсе адзначаныя выпадкі двухгукавых кансанантных спалучэнняў. З мэтай праверкі навыку складападзелу мы правялі эксперымент сярод студэнтаў 3-га курса дзённай формы атрымання адукацыі МДУ імя А.А. Куляшова, якія навучаюцца па спецыяльнасці "Пачатковая адукацыя". Студэнтам былі прапанаваны для выканання практыкаванні з вучэбных дапаможнікаў па беларускай (№№ 62, 64, 65, 66, 68) і рускай (№№ 104, 107) мовах для 2-га класа. Ва ўсіх практыкаваннях неабходна было ажыццявіць падзел слоў на склады. Лексічны матэрыял практыкаванняў змяшчае 20 лексічных адзінак (13 на беларускай мове, 7 на рускай) са спалучэннямі зычных гукаў у становішчы паміж галоснымі ў сярэдзіне слова (гл. табліцу 1).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Табліца* 1

**Спалучэнні зычных у словах, прапанаваных для аналізу**

<table>
<tr><th rowspan="2">Спалучэнне зычных</th><th colspan="2">Лексічны матэрыял практыкаванняў</th></tr>
<tr><th>на рускай мове</th><th>на беларускай мове</th></tr>
<tr><td>шумны + шумны</td><td>де|вчонкой</td><td>гу|стым, да|жджу, лісі|чкі</td></tr>
<tr><td>шумны + санорны</td><td>сего|дня</td><td>гры|бнік, ля|снік, ма|слякі</td></tr>
<tr><td>санорны + шумны</td><td>боль|шое, девчон|кой, нель|зя, чехар|ду</td><td>буль|ба, вавёр|кам, зялён|кі</td></tr>
<tr><td>[й] / [ў] + санорны / шумны</td><td></td><td>гай|ка, крэй|да, садоў|нік</td></tr>
<tr><td>санорны + санорны</td><td>ко|рнями (або кор|нями),<br>си|льный (або силь|ный)</td><td>сы|рнік (або сыр|нік)</td></tr>
</table>

Вынікі выканання заданняў (у эксперыменце прыняў удзел 31 студэнт) адлюстраваны ў табліцы 2.

*Табліца* 2

**Выкананне студэнтамі падзелу на склады слоў з кансанантнымі спалучэннямі**

<table>
<tr><th rowspan="2"></th><th rowspan="2">Слова для складападзелу</th><th colspan="2">Студэнты, якія правільна выканалі складападзел</th><th colspan="2">Студэнты, якія няправільна выканалі складападзел</th></tr>
<tr><th>колькасць</th><th>працэнт</th><th>колькасць</th><th>працэнт</th></tr>
<tr><td rowspan="4">Ш+Ш</td><td>густым</td><td>5</td><td>16,1</td><td>26</td><td>83,9</td></tr>
<tr><td>дажджу</td><td>7</td><td>22,6</td><td>24</td><td>77,4</td></tr>
<tr><td>девчонкой</td><td>2</td><td>6,5</td><td>29</td><td>93,5</td></tr>
<tr><td>лісічкі</td><td>13</td><td>41,9</td><td>18</td><td>58,1</td></tr>
<tr><td rowspan="4">Ш+С</td><td>грыбнік</td><td>6</td><td>19,4</td><td>25</td><td>80,6</td></tr>
<tr><td>ляснік</td><td>6</td><td>19,4</td><td>25</td><td>80,6</td></tr>
<tr><td>маслякі</td><td>6</td><td>19,4</td><td>25</td><td>80,6</td></tr>
<tr><td>сегодня</td><td>12</td><td>38,7</td><td>19</td><td>61,3</td></tr>
<tr><td rowspan="7">С+Ш</td><td>большое</td><td>23</td><td>74,2</td><td>8</td><td>25,8</td></tr>
<tr><td>бульба</td><td>20</td><td>64,5</td><td>11</td><td>35,5</td></tr>
<tr><td>вавёркам</td><td>25</td><td>80,6</td><td>6</td><td>19,4</td></tr>
<tr><td>девчонкой</td><td>28</td><td>90,3</td><td>3</td><td>9,7</td></tr>
<tr><td>зялёнкі</td><td>25</td><td>80,6</td><td>6</td><td>19,4</td></tr>
<tr><td>нельзя</td><td>21</td><td>67,7</td><td>10</td><td>32,3</td></tr>
<tr><td>чехарду</td><td>22</td><td>71,0</td><td>9</td><td>29,0</td></tr>
<tr><td rowspan="3">[й]/[ў] + Ш/С</td><td>гайка</td><td>27</td><td>87,1</td><td>4</td><td>12,9</td></tr>
<tr><td>крэйда</td><td>27</td><td>87,1</td><td>4</td><td>12,9</td></tr>
<tr><td>садоўнік</td><td>27</td><td>87,1</td><td>4</td><td>12,9</td></tr>
<tr><td rowspan="3">С+С</td><td>корнями</td><td>25 (кор|нями)<br>6 (ко|рнями)</td><td>80,6<br>19,4</td><td>–</td><td>–</td></tr>
<tr><td>сильный</td><td>23 (силь|ный)<br>8 (си|льный)</td><td>74,2<br>25,8</td><td>–</td><td>–</td></tr>
<tr><td>сырнік</td><td>24 (сыр|нік)<br>7 (сы|рнік)</td><td>77,4<br>22,6</td><td>–</td><td>–</td></tr>
</table>

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Самая агульная выснова, якая вынікае з атрыманых даных: большая частка ўдзельнікаў эксперымента (ад 93,5 да 58,1 працэнта па асобных словах) пры складападзеле раздзяляе спалучэнне зычных гукаў, не беручы пад увагу характарыстыку гукаў паводле ўдзелу голасу і шуму (санорны – шумны), г. зн. ігнаруючы санорную тэорыю склада. Адзначым, што ніводзін з удзельнікаў эксперымента не выканаў заданне бездакорна.

Такім чынам, праведзенае даследаванне засведчыла, што вучэбныя дапаможнікі на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі прапануюць разнастайны лексічны матэрыял для падзелу на склады. Студэнты спецыяльнасці "Пачатковая адукацыя" не ў поўнай меры валодаюць навыкам складападзелу, што патрабуе пільнай увагі выкладчыкаў дысцыплін модуля "Тэарэтычныя асновы пачатковай моўнай адукацыі" на факультэце пачатковай і музычнай адукацыі.

## Літаратура


1. Антановіч, Н. М. Беларуская мова : вучэбны дапаможнік для 2 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання. У 2 ч. Ч. 1 / Н. М. Антановіч, Н. У. Антонава. – Мінск : НІА, 2022. – 144 с.
2. Антипова, М. Б. Русский язык : учебное пособие для 2 класса учреждений общего среднего образования с белорусским языком обучения. В 2 ч. Ч. 1 / М. Б. Антипова. – Минск : НИО, 2020. – 144 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова